


# Вячэрнія радкі

…Сама у сябе як след яшчэ не веру.
Ды словы распускаюцца, як мак.
І падае на белую паперу



Яўгенія Іосіфаўна Янішчыц нарадзілася 20 лістапада 1948 года ў вёсцы Рудка Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў простай сялянскай сям'і .

Маці Жэні — Марыя Андрэеўна — працаўніца калгаса, бацька — Іосіф Сцяпанавіч — бондар, цясляр.

Першы муж маці, Ёзас Янішчыц, загінуў на вайне ў 1944 годзе, ад яго Яўгеніі засталося прозвішча (аб гэтым яна пісала ў вершы «Памяці Ёзаса Янішчыца»).

У 1955 годзе Яўгенія Янішчыц пайшла ў першы клас Рудкаўскай пачатковай школы. У чацвёртым класе Жэня напісала свой першы верш і прысвяціла яго маці. Пасля заканчэння Рудкаўскай пачатковай школы Жэня вучылася ў Мерчыцкай васьмігодцы. У снежні 1962 года ў раённай газеце «Палеская праўда» з'явіліся першыя друкаваныя творы Яўгеніі.

1 верасня 1963 Жэня прыйшла ў 9 клас Парэцкай сярэдняй школы. У гэтым жа годзе яна напісала свой рукапісны зборнік вершаў «Першыя россыпы». Яе вершы друкуюцца ў раённай газеце і

У 1969 годзе Жэня прымала ўдзел ва Усесаюзнай нарадзе маладых паэтаў і пісьменнікаў у Маскве. У 1970 годзе выйшаў першы зборнік «Снежныя грамніцы».

У 1971 годзе Яўгенію Янішчыц прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. У гэтым годзе яна закончыла універсітэт і працуе загадчыцай бібліятэкі ЦКЛКСМБ. Выходзіць замуж за беларускага паэта Сяргея Панізніка, тады вайскоўца, і маладыя едуць у Чэхаславакію.





Сяргей працуе ваенным карэспандэнтам, а Жэня ўладкоўваецца на працу ў бібліятэку адной з воінскіх часцей. Праз год Яўгенія вяртаецца на радзіму. 14 лістапада 1972 года яна стала маці — нарадзіла сына Андрэя.

У 1974 годзе выходзіць кніга «Дзень вечаровы», за якую атрымала прэмію Ленінскага камсамола Беларусі ў 1978 годзе.

Асабістае жыццё складвалася няўдала. Пасля разводу жыла адна, выхоўвала сына, сумленна несла грамадскія нагрузкі. Творчая кар’ера, не ў прыклад асабістага жыцця, складвалася паспяхова. Яўгенія Янішчыц — дэпутат райсавета Савецкага раёна г. Мінска, член праўлення і прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Свае карэспандэнцыі падпісвала псеўданімамі Ж. Заметкіна, Е. Іосіфава, Ясяльдзянка. Вершы яе змяшчаліся ў часопісах «Маладосць», «Беларусь», «Неман», «Молодая гвардия», «Дружба народов», «Огонек», газетах «Литературная Россия», «Литературная газета», альманаху «Поэзия», штогодніку «Дзень паэзіі», калектыўных зборніках БДУ і Гамбургскага педінстытута, у анталогіі маладой беларускай паэзіі на Украіне.



Вершы Я. Янішчыц перакладзены на англійскую, балгарскую, іспанскую, нямецкую, польскую, рускую, украінскую мовы. На словы паэтэсы кампазітары Р. Давыдаў, Ю. Семяняка, М. Юрко і інш. напісалі песні.

«Простая, працавітая і добрая», – гэтыя словы гучаць пра Яўгенію Янішчыц і ў нашы дні. Жанчына, чый вобраз застаецца ў сэрцы, а вершы застываюць у памяці.

У гонар 65-гадовага юбілею Яўгеніі Янішчыц сябры пісьменніцы адказалі на некалькі пытанняў.



**– Кажуць, у Яўгеніі Іосіфаўны быў цяжкі лёс. Гэта звязана з разрывам паміж мужам і жонкай?**

– Так, яна вельмі яго кахала… Аднаюбкай была. Яшчэ яна ў аварыю трапіла. Сынок да школы жыў у Жэнінай маці, яна прыязджала, калі быў вольны час, і мы сустракаліся ў яе доме, размаўлялі пра жыццё, як суседзі, за кубачкам гарбаты. Мы добра з ёй сябравалі. Яна прыязджала на свой дзень нараджэння, ёй як раз спаўнялася 40 гадоў. Была з намі суботу і нядзелю, мы яе праводзілі, а ў пятніцу Жэні ўжо не стала… Колькі яна пісала вершаў… Яны ўсе ў яе былі простыя, душэўныя, пра людзей, прыроду. Яна любіла жыццё, любіла народ, і ўсё пісала… (З інтэрв'ю з Марыяй Пятроўнай КОЗЕЛ)




Presentation-Graphics.com

**– Як вы пазнаёміліся з Яўгеніяй Янішчыц? Якой яна вам запомнілася?**

– Іх сям’я жыла паміж нашым домам і домам Марыі Пятроўны Козел, вось так мы і пазнаёміліся. Мы з яе мамай вельмі сяабравалі, яна добрая была жанчына. Жэнька ўжо хадзіла ў школу ў Парэчча. Пакуль дом у іх быў не скончаны, яна да нас прыходзіла. І пасядзіць з намі, і паначуе. Жылі добра з ёй. Чалавек яна была светлы. Жэнька, як толькі прыязджала сюды, дык адразу пісала-пісала, паперамі абкладзецца і працуе, а потым чытала нам. Яна была вельмі добрай, маме дапамагала заўсёды. Яна была вельмі здольнай дзяўчынкай, не баялася працы, усё ўмела.




**– Яўгенію называлі «ластаўкай Палесся». Як вы лічыце, чаму?**

– Яна была такая лёгкая на ўздым, яе вершы – светлыя, прыгожыя, песень шмат пісала. Жэню, як яна з’ехала вучыцца, мы заўсёды чакалі. Яна пастаянна прывозіла шмат падарункаў. З Амерыкі, дзе была прадстаўніком у ААН, прывезла вельмі прыгожую хустку (такую ж яна прывезла і Марыі Пятроўне Козел), яна ў мяне да

[redacted]





[redacted]

Падрыхтавалі:



ввадоўская Маргарыта

Лыонг Лінда

Дзякуем за прагляд!